УДК 373.5

# ФАРМІРАВАННЕ Ў ВУЧНЕЎСКАЙ МОЛАДЗІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ АБ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ: МАГЧЫМАСЦІ ДЫДАКТЫЧНАГА КАНСТРУЯВАННЯ

**С.В. Паноў**
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, didmet@tut.by

Ва ўмовах сучасных спроб дэсакралізацыі гістарычнай памяці аб ролі Савецкага Саюза ў разгроме нацысцкай Германіі, якія прадпрымаюцца  ў еўрапейскім грамадстве, актуалізуецца дыдактычная мэтазгоднасць гераізацыі подзвіга савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне з дапамогай гістарычнай адукацыі. Сацыелагічныя апытанні сведчаць, што сучаснае маладое пакаленне мала цікавіцца гісторыяй вайны, а яе героі не з'яўляюцца прыкладам для падабенства, складаючы ў сукупнасці каля 2 % ад узроўню папулярнасці [1, с.25]. Гістарычная памяць разумеецца сучаснымі яе даследчыкамі, як сукупнасць ведаў і масавых уяўленняў соцыума аб сваім агульным мінулым; як усе віды інфармацыі аб падзеях мінулага, іх часе і месцы, удзельніках гістарычных падзей; як здольнасць даражыць гістарычнымі традыцыямі свайго народа  [4, с.22; 7, с.38; 9, с.215].

Дыдактычныя магчымасці для фарміравання гістарычнай памяці як сацыяльна–педагагічнай катэгорыі бачацца ў працэсе рэалізацыі культуралагічнай парадыгмы гістарычнай адукацыі, згодна з якой змест адукацыі разглядаецца як сацыяльны вопыт, якім валодаюць старэйшыя пакаленні. У гэтым сэнсе цікава пазіцыя сучаснай вучнеўскай моладзі як пераемнікаў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Характэрнымі з'яўляюцца наступныя выказванні студэнтаў:

– перамаглі нашы дзеды, прадзеды і мы ганарымся імі і іх перамогай;

– калі кажам «мы перамаглі», гэта азначае «мы, рускія,  перамаглі», а гэта няправільна;

– «мы» – гэта супольнасць, гэта і рускія, і ўкраінцы, і беларусы, народы, што ўваходзілі ў СССР;

– «мы перамаглі», але лічыць сябе перамнікамі?, мы ж не ваюем ні з кім;



Полесгу

– калі сумленна, то не адчуваем і не бачым пераемнасці [2, с.32].

Такія выказванні сведчаць, як адзначаюць псіхолагі, аб тым, што вучнеўская моладзь знаходзіцца ў сітуацыі разарваных сувязей паміж пакаленнямі, калі інфармацыйная прастора адкрытага сацыяльнага асяроддзя вядзе ў сілу перавагі ў ей негатыўных падзей да накаплення моладзю негатыўнага вопыту [8, с. 60, 62]. Становіцца відавочнай мэтазгоднасць дыдактычнага канструявання гістарычнай памяці ў сучаснай вучэбна–інфармацыйнай прасторы.

Гістарычная памяць аб’ядноўвае сучаснасць з мінулым. Рэальна чалавекам успрымаецца толькі сегмент  сучаснага, а мінулае і будучыня ўяўляюцца толькі ў выглядзе ўяўленняў (вобразаў), якія лакалізуюцца ў пэўнай прасторы і актуалізуюца ў часе. Таму дыдактычнае канструяванне калектыўнай гістарычнай памяці патрабуе ўстанаўлення максімальнай колькасці прасторава–часовых сувязей паміж існуючай рэальнасцю і фактамі мінулага, інтарэс к якім выкліканы сучаснымі праблемамі. Пры гэтым мэтазгодна выкарыстанне канцэпцыі месц памяці, якія маюць статус нацыянальных святынь (П. Нора) [3, с. 17–50].

Гістарычная памяць захоўвае і аднаўляе звесткі аб мінулым на падставе пачуццяў, выкліканых сучаснасцю. Таму актуалізуецца мэтазгоднасць фарміравання вопыта эмацыянальна–пачуццевых адносін як аднаго з кампанентаў трансліруемага ў працэсе навучання гісторыіі сацыяльнага вопыта. Такі вопыт не з’яўляецца ў прамым сэнсе прадуктам навучання, а выступае яе вынік перажывання і асэнсавання асабіста значымых падзей у сучаснай жыццядзейнасці вучнеўскай моладзі [6, с. 18–19].

У якасці практыка–арыентаванай рэкамендацыі патрэбна ўлічыць параду беларускіх сацыелагаў аб неабходнасці напоўніць калектыўную гістарычную памяць вучнеўскай моладзі сімвалічным зместам па той прычыне, што яе самасвядомасць застаецца невызначанай і не з’яўляецца эмацыянальна афарбаванай [5, с. 13]. Такім збіральным сімвалам Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне бачыцца Сцяг Перамогі, падняты ў ноч на 1 мая 1945 г. над  рэйхстагам. На шырокавядомым фотаздымку франтавога карэспандэнта Я. Халдзея, які мастацкмі сродкамі адлюстраваў дадзеную падзею, паказаны франтавыя разведчыкі ўкраінец, поўны кавалер ордэна Славы Аляксей Кавалеў; беларус Леанід Горычаў; дагестанец Абдулхакім Ісмаілаў, якому ў 1996 г. было прысвоена званне Героя Расіі. Сімвалічным у гэтым сэнсе з’яўляецца дружба савецкіх народаў, якая стала адной з крыніц яго Перамогі, што патрабуе сваей акцэнтацыі ў працэсе транслыцыі сацыяльнага вопыту ад старэйшага да маладога пакалення.

Сімвалы гістарычных падзей фарміруюцца праз пачуцце суперажывання, у т.л. з суайчыннікамі – удзельнікамі і сведкамі ваенных падзей. Менавіта ў іх асобасных гісторыях аб’ядноўваюцца грамадскія і індывідуальныя выпрабаванні, адбываецца суаднясенне індывідуальных рашэнняў з навакольным кантэкстам, што важна для разумення матывацыі паводзін людзей у гісторыі. Варта заўважыць, што на аснове засваення спосабаў паводзін гістарычных асоб ці іх адлюстравання мастацкімі сродкамі могуць фарміравацца асобасныя ідэалы вучнеўскай моладзі. Мэтазгодным для засваенне вучнеўскай моладдзю можы быць прыклад паводзін лётчыка Аляксандра Мамкіна, які  ў красавіку 1944 г. у час блакады карнікамі Полацка–Лепельскай партызанскай зоны вывозіў з аднаго з лясных аэрадромаў дзяцей з Полацкага дзіцячага дома. Пры падлеце да лініі фронту самалёт быў падбіты. У лётчыка загарэўся камбінезон і шлемафон, уплавіліся ў твар лётныя акуляры, абугліліся да костак ногі. Нават у такім стане лётчык не кінуў штурвал, дацягнуў да аэрадрома і пасадзіў самалёт. Апошнім яго клопатам у жыцці стала выратаванне дзяцей.

Такім чынам, гістарычная адукацыя, як сацыяльны інстытут, стварае ўмовы для трансляцыі гераічных і трагічных падзей Вялікай Айчыннай вайны праз дыдактычнае канструяванне іх калектыўных уяўленняў (вобразаў), як ментальных канструкцый, што ствараюцца нашчадкамі ў працэсе пазітыўнага ці негатыўнага ацэньвання папярэднікаў і для абгрунтавання сучасных рашэнняў і дзеянняў. Фарміраванне ў вучнеўскай моладзі калектыўнай гістарычнай памяці арыентавана на прадстаўленне у змесце вучэбнага гістарычнага матэрыялу збіральных сімвалаў Вялікай Перамогі і ўзораў паводзін гістарычных ці літаратурных персанажаў як біяграм, што прадугледжвае расрыцце эмацыянальнага стану асобы ва ўмовах ваенных выпрабаванняў і стварэнне сітуацыі суперажывання.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

1. Багдасарян, В.Э. Государственная историческая политика и национальная безопасность России / В.Э. Багдасарян // Преподавание истории в школе. – 2014. – № 7. – С.18 – 29.

2. Галкина, О.И. Фокус–группа как метод изучения исторического сознания молодежи / О.И. Галкина // Преподавание истории в школе. – 2014. – № 5.  С.30 – 29.



Полесгу

3. Нора, П. Проблематика мест памяти // Франция – память / П. Нора, М. Озуф, Ж. де Пюимеж, М. Винок. – СПб : Изд–во С.–Петерб. ун–та, 1999. – 328 с.

4. Репина, Л.П. История и память: историческая культура Европы до начала нового времени / Л.П. Репина [и др.]. – М. : Кругъ, 2006. – 768 с.

5. Ротман, Д.Г. Тенденции изменения ценностного сознания студенческой молодежи Республики Беларусь / Д.Г. Ротман, А.В. Посталовский, И.Д. Расолько // Адукацыя і выхаванне. – 2013. – № 11. – С.3– 13.

6. Сериков, В.В. Обучение как вид педагогической деятельности : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / В.В. Сериков ; под ред. В.А. Сластенина, И.А. Колесниковой. – М. : Издательский центр «Академия», 2008. – 256 с.

7. Соколова, М.В. Что такое историческая память? / М.В. Соколова // Преподавание истории в школе. □ 2008. – № 7. – С.37 – 44.

8. Фельдштейн, Д.И. Приоритетные направления психолого–педагогических исследований в условиях значимых изменений ребенка и ситуации его развития / Д.И. Фельдштейн // Адукацыя і выхаванне. – 2010. – № 11. – С. 59–66.

9. Яценко, Н.Е. Обществоведческий словарь / Н.Е. Яценко. – СПб. : Издательство «Лань», 2006. □ 672 с.

ПолесГУ